ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
АШМЯНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

праводзяць VII навукова-практычную канферэнцыю «Гальшанскія чытанні»
«Ашмяншчына – рэгіянальныя асаблівасці развіцця X-XX стст.»

Плануемае поле канферэнцыі:
¬ Ашмяны, Гальшаны і ваколіца паводле археалагічных крыніц;
¬ развіццё Ашмяншчыны ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
¬ Ашмяншчына ў XIX – XX стагоддзях;
¬ шляхецкія роды Ашмяншчыны;
¬ сацыяльная прастора Ашмяншчыны (сацыяльныя і маёмасныя группы, іх узаемаадносіны, роля ў гісторыі краю);
¬ культурная спадчына Ашмяншчыны (архітэктура, мастацтва, асвета, літаратура, этнаграфія і інш.);
¬ сельская гаспадарка, рамяство, гандаль, вытворчасць, шляхі зносін у гісторыі краю;
¬ славутыя імёны Ашмяншчыны.

Час правядзення канферэнцыі: 20 мая 2016 г.
Плануемае месца правядзення канферэнцыі – г. Ашмяны Гродзенскай вобл.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да 15 красавіка 2016 г.
У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail.
Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі.
Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да 3 мая 2016 г.
Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў: аб'ём – не болей 40 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце: dounar_zagor@ mail.ru
Кантакты: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.
Тэл. (017) 284-14-09, факс (017) 284-18-70. Доўнар Аляксандр Барысавіч,
e-mail: dounar_zagor@ mail.ru.
Харчаванне аплачваецца арганізатарамі канферэнцыі, праезд за кошт камандзіруючага боку.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская.